# Урокі жыццёвай важнасці.

Прайшаў адзіны ўрок бяспекі для навучэнцаў Жарабковіцкай СШ. У рамках месячніка грамадзянска-патрыятычнага выхавання адзіны ўрок бяспекі для навучэнцаў 2–7-х класаў Жарабковіцкай сярэдняй школы імя М. Г. Мінкевіча правялі супрацоўнікі РАНС і Асвода. Старшыня Ляхавіцкай раённай арганізацыі Асвода ўдзяліў асаблівую ўвагу бяспецы паводзін у зімовы перыяд. З мэтай фарміравання культуры бяспекі жыццядзейнасці навучэнцаў інспектар Ляхавіцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Таццяна Калгушкіна нагадала рабятам пра правілы пажарнай бяспекі, якія неабходна строга выконваць. За актыўны ўдзел у інтэрактыўных гульнях навучэнцам уручаны тэматычныя падарункі.



#здоровые _города